УДК 7.036:7.072

# Даследаванне выяўленчага мастацтва XX стагоддзя: арсенал сучасных метадалагічных падыходаў

***Цыбульскі М. Л.***
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава", Віцебск*

*У артыкуле праводзіцца аналіз комплексу метадалагічных рэсурсаў, якія выкарыстоўваюцца сучасным мастацтвазнаўствам для даследавання мастацтва XX стагоддзя, вызначаецца арсенал метадалагічных падыходаў, што найбольш адпавядаюць мэце працы.*

*Разглядаюцца некаторыя асаблівасці эвалюцыі метадалагічных канцэпцый, метады іх тыпалагізацыі і выкарыстанне для рашэння канкрэтных задач. Аналізуюцца асаблівасці гісторыі даследавання мастацтва XX стагоддзя ў кантэксце развіцця метадалогіі, пачатковы этап фарміравання мастацтвазнаўчых метадаў у савецкім мастацтвазнаўстве (1920-я гады). Важнае значэнне аўтар надае зменам у метадалагічных падыходах да аналізу мастацтва XX стагоддзя, звязаных з 1970-мі гадамі, калі ці не ўпершыню ставіцца задача сінтэзу мастацтвазнаўчых метадаў, арганічнага спалучэння іх элементаў і магчымасцяў. Станаўленне структуралiцкага і семантычнага метадаў у гэты перыяд спрыяла развіццю ў мастацтвазнаўстве навуковага комплекснага сістэмнага падыходу.*

*Разглядаючы метадалогію даследавання мастацтва XX стагоддзя на сучасным этапе, аўтар асаблівую ўвагу звяртае на міждысцыплінарны комплексны падыход, на шырокі кантэкст духоўных універсалій у рэчышчы агульнай дынамікі развіцця гістарычных працэсаў.*

***Ключавыя словы:*** *мастацтвазнаўства, XX стагоддзе, метадалогія, метад, фармальна-стылістычны, гісторыка-параўнальны, параўнальна-супастаўляльны, структуралісцкі, семантычны, семіятычны, сацыялагічны, кампаратывісцкі метады, комплексны сістэмны аналіз, міждысцыплінарны падыход.*

*(Искусство и культура. – 2019. – № 2(34). – С. 5–10)*

# The Study of the XX Century Fine Arts: a Set of the Contemporary Methodological Approaches

***Tsybulski M. L.***
*Educational Establishment "Vitebsk State P. M. Masherov University", Vitebsk*

*An analysis of a complex of methodological resources which are applied by the contemporary art critics to study the XX century art is conducted in the paper; an arsenal of methodological approaches is singled out which correspond the purpose of the research.*

*Some features of the evolution of methodological concepts are considered as well as methods, typology and application to solve definite problems. Features of the history of the XX century art studies in the context of the development of the methodology are identified as well as the initial stage of shaping art critic methods in the Soviet art critics (the 1920-s), maturation of the formal and stylistic and the sociological analysis. The author pays special attention to the analysis of the transformation in the methodological approaches to the XX century art analysis, which are connected with the 1970-s, when, almost for the first time, the task is set to synthesize art critic methods, to organically join their elements and possibilities in the art phenomena analysis. The inclination to analyze the art language in that period fostered the development the structuralist and the semantic methods and, finally, facilitated the development of the scientific complex system approach in art critics.*

*While analyzing the methodology of the XX century art studies at the present stage the author pays special attention to the interdisciplinary complex approach, to the aspiration to consider art in the wide context of spiritual universals as general dynamics of the development of historical processes.*

***Key words:*** *art critics, XX century, methodology, method, formal and stylistic, historical comparative, comparative, structuralist, semantic, semiotic, sociological methods, complex and system analysisз, interdisciplinary approach.*

*(Art and Cultur. – 2019. – № 2(34). – P. 5–10)*

*Адрас для карэспандэнцыі: mtsybulsky@rambler.ru – М. Л. Цыбульскі*



Репозиторий ВГУ

Ужо напрыканцы ХХ стагоддзя нельга было не заўважыць парадыгмальных змен у мастацтвазнаўстве, якія былі выкліканы хутказменлівы характарам мастацтва мінулага стагоддзя. Мастацтвазнаўцы ў чарговы раз сутыкнуліся з неабходнасцю пераасэнсавання агульнапрынятай перыядызацыі, нераспрацаванасцю, недакладнасцю тэрміналогіі інструментарыя, які выкарыстоўваецца для аналізу актуальных мастацкіх практык і шэрагам іншых праблем.

У канцы 90-х гадоў ХХ стагоддзя вядомы расійскі мастацтвазнавец Д. Сараб'янаў у сваім артыкуле “Некаторыя метадалагічныя пытанні мастацтвазнаўства ў сітуацыі гістарычнай мяжы” адзначыў уяўную “нераспрацаванасць метадалогіі і інструментарыя айчыннай мастацтвазнаўчай навукі” [1]. Даследчык падкрэсліваў: “Наша мастацтвазнаўства знаходзіцца (...) ў цяжкім становішчы. Яно разгублена перад тварам сучаснага мастацтва, дасягненнямі іншых гуманітарных навук і поспехамі заходняга мастацтвазнаўства”. Сапраўды, канец ХХ стагоддзя паказаў відавочную непадрыхтаванасць мастацтвазнаўства да аналізу мастацтва гэтага часу, неактуальнасць некаторых падыходаў і метадаў даследавання. У той жа час вызначэнне пазіцыі мастацтвазнаўцы ў адносінах да іншых роднасных навуковых дысцыплін і прадмета даследавання, як і неабходнасць дасканалай працы па выбару метадалогіі, аказваліся не менш актуальныя, чым шмат гадоў таму.

Мэта дадзенага артыкула – правесці аналіз комплексу метадалагічных рэсурсаў, якія выкарыстоўваюцца сучасным мастацтвазнаўствам для даследавання мастацтва ХХ стагоддзя, вызначыць арсенал метадалагічных падыходаў.

**Агульныя пытанні метадалогіі даследавання мастацтва ХХ стагоддзя.** Звяртаючыся да вызначэння метадалогіі даследавання мастацтва ХХ стагоддзя мы маем на ўвазе сістэму метадаў, характэрную для мастацтвазнаўства ў кантэксце асэнсавання вялікай гістарычнай эпохі. Відавочна, што “гісторыя любой навукі – гэта гісторыя падыходаў, г. зн. метадаў, якія спрыяюць больш яснаму погляду на прадмет, больш аб'ектыўнай яго ацэнцы, але самае галоўнае – набліжаюць нас да яго разумення...” [2].

Цікавасць да тэарэтычных і метадалагічных аспектаў сёння з'яўляецца адной з істотных характарыстык і агульнай рысай развіцця айчыннай і замежнай гісторыі мастацтва. Сучаснае мастацтвазнаўства характарызуецца наяўнасцю ў ім самых разнастайных метадаў даследавання, якія накіраваны на аналіз розных узроўняў мастацтва і мастацкіх практык ХХ стагоддзя. “Між тым праблема суаднясення і ўзаемадзеяння ўсіх метадаў даследавання мастацтва, вызначэння сферы іх выкарыстання далёка не заўжды адназначна вырашана” [3].

У мастацтвазнаўстве пошукі метадалогіі паўстаюць, у першую чаргу, як спроба вызначыць спектр метадалагічных падыходаў, якія ў найбольшай ступені адпавядаюць пастаўленым мэтам і задачам даследавання. На жаль, праблема эвалюцыі метадалогіі аналізу мастацтва ХХ стагоддзя ў айчыннай эстэтыцы і мастацтвазнаўстве да гэтага часу спецыяльна не даследавалася, але, у той ці іншай ступені, закраналася ў працах навукоўцаў. У той жа час у апошняй чвэрці ХХ ст. і першых дзесяцігоддзях ХХІ стагоддзя з'явілася нямала англамоўных навуковых выданняў, якія былі прысвечаны блізкай, ці падобнай праблематыцы. У большасці з іх пераглядаліся метадалагічныя канцэпцыі, ішоў працэс фарміравання міждысцыплінарных падыходаў, пошуку новай навуковай парадыгмы [4].

**Метады даследавання ў сучаснай навуцы і іх тыпалагізацыя.** Метад навуковага даследавання прадугледжвае выкарыстанне пэўных тэхналогій, што выкарыстоўваюцца для рашэння канкрэтных навуковых задач. Выбар метаду цалкам вызначаецца характарам праблемы, якая даследуецца. Выбіраючы тыя ці іншыя метады, мы па сутнасці спрабуем адказаць на пытанне, як плануем даследаваць мастацтва ХХ стагоддзя.

Метад і тэхналогія тоесна злучаны паміж сабой. Метад вызначае агульны кірунак, агульны прынцып арганізацыі даследаванняў, у той час як тэхналогіі (а іх у межах метаду можа выкарыстоўвацца некалькі) вызначаюць канкрэтныя дзеянні, якія забяспечваюць рэалізацыю даследчых задач. З кожным новым даследаваннем тэхналогіі могуць змяняцца, у межах кожнай з іх могуць быць выкарыстаны розныя методыкі. Менавіта тэхналогіі надаюць даследаванню непаўторны характар. Цікава, што з'яўляючыся інструментам даследавання, метады – вынік і нават дасягненне на пэўным этапе развіцця навукі.

Як вядома, у навуцы вылучаюць тры тыпы метадаў: філасофскія, агульнанавуковыя і спецыяльныя. Філасофскія метады часам невыпадкова называюць базавымі, паколькі звычайна яны маюць філасофскае абгрунтаванне і вызначаюць фундаментальныя падыходы. Гэтыя метады ў роўнай ступені забяспечваюць прадуктыўнасць даследаванняў як у філасофіі, так і ў галіне мастацтвазнаўства, пры тым, што ў кожнай з навуковых галін



Рэпазіторый ВДУ

маюцца свае асаблівасці іх выкарыстання. Выбар базавых метадаў залежыць ад праблемы, якая вывучаецца, зместу пастаўленых задач, матэрыялу даследавання. Сярод такіх метадаў прыгадаем эмпірычныя (скіраваныя на назапашванне фактычнага матэрыялу, яго аналіз і сістэматызацыю) і тэарэтычныя (звязаныя з асэнсаваннем і структурызацыяй мастацтва, распрацоўкай гіпотэз і г. д.), якія сёння аказваюцца аднолькава істотнымі для мастацтвазнаўства. Пры гэтым эмпірычныя даследаванні не толькі дапамагаюць збору матэрыялу, але адначасова даюць магчымасць праверыць і скарэкціраваць вынікі тэарэтычных разважанняў.

Агульнанавуковыя метады ў большай меры чым філасофскія здольныя ўлічваць спецыфіку прадмета, яны больш канкрэтныя, а таму часцей распрацоўваюцца ў той ці іншай канкрэтнай навуцы, але могуць быць запазычаны і з сумежных навук у адпаведнасці з пастаўленымі задачамі. Да агульнанавуковых метадаў адносяць: апісальны, кампаратывісцкі (параўнальны), параўнальна-гістарычны, структурны, тыпалагічны, структурна-тыпалагічны, сістэмны, рэканструктыўны і інш. У залежнасці ад прадметнай галіны кожнай канкрэтнай навукі і выбранага ракурсу даследавання агульнанавуковыя метады могуць карэкціравацца, набываць новыя ўласцівасці. Адзначым, што гэтыя метады сёння займаюць дамінуючыя пазіцыі ў мастацтвазнаўстве.

Пры выкарыстанні кампаратывісцкага метаду з’яўляецца магчымасць выявіць агульныя асаблівасці канкрэтных з’яў і аб’ектаў на аснове параўнання іх разнавіднасцяў. Калі структурны метад з’арыентаваны на вывучэнне ўнутранай структуры аб’екта і сувязяў паміж яго часткамі, то тыпалагічны скіраваны на сістэматызацыю, класіфікацыю аб’ектаў даследавання, асэнсаванне прыроды класіфікацыйных адрозненняў. Для пашырэння і паглыблення тыпалагічнага аналізу структурны і тыпалагічны метады часам аб’ядноўваюць у структурна-тыпалагічны. Сістэмны метад арыентаваны на падрабязнае апісанне аб’екта, на выяўленне яго ўнутранай арганізацыі і функцыянальных сувязяў [5]. На аснове агульнанавуковых метадаў паступова складваюцца і спецыяльныя метады, якія, як правіла, выкарыстоўваюцца ў асноўным толькі ў межах канкрэтнай галіны ведаў.

Дапоўнім, што існуе, напрыклад, і такая тыпалагізацыя метадаў: тэарэтычныя метады (накіраваныя на распрацоўку катэгарыяльнага апарату мастацтвазнаўства), прыкладныя (прысвечаныя аналізу канкрэтных з’яў і форм мастацтва) і сінтэтычныя (заснаваныя на выкарыстанні двух папярэдніх груп метадаў).

**Некаторыя асаблівасці гісторыі даследавання мастацтва XX стагоддзя ў кантэксце развіцця метадалогіі.** Ужо на самым пачатку XX стагоддзя, тыя хто пісаў пра мастацтва гэтага часу, адчулі неабходнасць перасэнсавання вядомых метадаў аналізу, распрацоўкі новай навуковай метадалогіі. І хоць метады даследавання гісторыі і практыкі мастацтва на працягу мінулага стагоддзя неаднойчы змяняліся, тое што было распрацавана ў першай яго чвэрці ў галіне метадалогіі мастацтвазнаўства выклікае цікавасць у навукоўцаў, якія прысвячаюць гэтай праблеме свае артыкулы [6].

Тэорыя і метадалогія мастацтва XX ст. ствараліся амаль што паралельна з мастацкімі працэсамі, якія неадкладна патрабавалі свайго аналізу. Да пошуку новых метадаў асэнсавання мастацтва асабліва падштурхоўвалі практыкі авангардных кірункаў, якія ў першай палове мінулага стагоддзя прадэманстравалі бездапаможнасць класічнай метадалогіі мастацтвазнаўства ў дачыненні да аналізу навейшых плыняў.

Пачатковы этап фарміравання мастацтвазнаўчых метадаў у савецкім мастацтвазнаўстве можна аднесці да 1920-х гадоў. Менавіта з гэтым перыядам звязана распрацоўка тэарэтычных асноў вывучэння выяўленчага мастацтва, праблем стылю. У імкненні да гістарычнай сістэматызацыі матэрыялу даследчыкі спрабавалі ўбачыць не толькі эвалюцыю творчасці асобных мастакоў, але і дынаміку мастацкіх працэсаў, суадносячы іх з гістарычнымі падзеямі, канкрэтным кантэкстам.

Відавочна, што гістарычная канкрэтыка мастацтва пачатку XX стагоддзя стала для мастацтвазнаўства асноўным матэрыялам, які выклікаў да жыцця адпаведную метадалогію. Невыпадкова вядомы гісторык мастацтва А. Сідараў, апісваючы пачатковы этап развіцця савецкага мастацтвазнаўства, адной з трох асноўных тэндэнцый гістарычнага вывучэння мастацтва называў фактаграфію, якая знайшла сваё адлюстраванне ў мастацкай крытыцы [7]. Паступова ключавымі метадамі мастацтвазнаўчай практыкі становяцца гістарычны і фармальны аналізы мастацтва. Узаемадзеянне двух гэтых метадаў стварыла першапачатковы метадалагічны грунт мастацтвазнаўчых даследаванняў.

Зварот да фармальна-стылістычнага аналізу твораў быў заканамерным для развіцця аналітычнага падыходу ў даследаванні выяўленчага мастацтва. Фармальны (фармальна-стылістычны) метад



Репозиторий БГУ

выкарыстоўваўся для вывучэння асаблівасцяў формы, разнастайных аспектаў стылю або мастацкага кірунку, творчага метаду, нацыянальных школ і індывідуальных манер мастакоў. Значную ролю ў яго станаўленні адыгралі ідэі і працы шэрага заходнееўрапейскіх гісторыкаў мастацтва (Г. Вельфлін, А. Рыгль і інш.). Даследчыкі мастацтва ў пачатку XX стагоддзя ўсё больш цікавяцца фенаменалогіяй стылю, праблемай мастацкай выразнасці, пытаннямі кампазіцыі ў цэлым і яе асобнымі аспектамі. У межах гэтага метаду актыўна распрацоўваецца спецыфічная тэрміналогія фармальнага аналізу. Увага мастацтвазнаўцаў сканцэнтравана не толькі на ўменні правільна ацэньваць асобны мастацкі помнік, але і на неабходнасці бачыць яго ў гістарычным кантэксце [8]. У метадалогіі айчыннага мастацтвазнаўства фармальнастылістычны метад паступова ператвараецца ў адзін з вядучых і займае ключавыя пазіцыі ў метадалагічным апараце комплексных даследаванняў.

Побач з развіццём фармальных метадаў у сярэдзіне 1920-х гадоў у савецкім мастацтвазнаўстве з'явіўся сацыялагічны метад, з дапамогай якога мастацкае жыццё, творчасць мастакоў, іх творы, аналізуюцца як з'явы канкрэтнай сацыяльнай рэальнасці. Своеасаблівым варыянтам ужывання сацыялагічнага метаду ў марксісцкім мастацтвазнаўстве быў "вульгарны сацыялагізм", у якім для любой мастацкай з'явы знаходзілі "сацыяльны эквівалент". Ідэйным натхняльнікам такога напрамку ў мастацтвазнаўстве стаў В. Фрычэ, які актыўна прапагандаваў "рух ад першапачаткова пануючага фармальнага метаду, праз яго пераадоленне да спробаў зацвердзіць сацыялагічны метад даследавання" [9]. У савецкім мастацтвазнаўстве гэты метад быў тоесна злучаны з марксісцка-ленінскай ідэалогіяй і абапіраўся на сістэму і іерархію дэкларуемых ёю каштоўнасцяў.

У 1930-я гады захапленне мастацтвазнаўства метадам фармальнага аналізу змянілася яго рэзкай крытыкай. Зацвярджэнне марксісцка-ленінскай метадалогіі, абвяшчэнне на афіцыйным узроўні прынцыпаў сацыялістычнага рэалізму пазначылі новыя прыярытэты для даследчыкаў і на доўгі час пераарыентавалі мастацтвазнаўства і яго метадалогію.

Змены ў метадалагічных падыходах да аналізу мастацтва XX стагоддзя адбываюцца ў 1970-я гады. Гэта перыяд актывізацыі метадалагічных пошукаў быў адначасова звязаны з узнаўленнем цікавасці да замежнага навуковага вопыту, з аднаўленнем сувязяў з дасягненнямі мастацтвазнаўства еўрапейскіх школ. Асабліва значным на гэтым шляху было пераасэнсаванне спадчыны венскай школы мастацтвазнаўства (М. Дворжак, О. Бенеш, Г. Вельфлін). Не меншая ўвага надавалася і паглыбленаму вывучэнню тэорыі і гісторыі айчыннага мастацтвазнаўства. Менавіта ў гэты час у айчынным мастацтвазнаўстве, ці не ўпершыню, ставіцца пытанне сінтэзу мастацтвазнаўчых метадаў, арганічнага спалучэння іх элементаў і магчымасцяў у аналізе мастацкіх з'яў. Называючы метады, якія сталі на той час ужо звыклым і абавязковым інструментарыем даследаванняў у еўрапейскім і айчынным мастацтвазнаўстве (іканаграфічны, фармалістычны, сацыялагічны, атрыбутыўны, семантыка-сімвалічны (семіятычны) і інш.), вядомы савецкі мастацтвазнавец В. Лазараў папярэджвае аб абмежаванасці кожнага з іх [10]. Адчуванне неабходнасці выкарыстання разнастайных метадаў аналізу мастацтва і сінтэзу метадалагічных падыходаў значна змяняе характар навуковых даследаванняў. Даволі актуальнымі ў 1970-я гады становяцца метады гісторыка-параўнальнага, параўнальна-супастаўляльнага аналізу. Аб іх папулярнасці і запатрабаванасці можна меркаваць не толькі па артыкулах у навуковых часопісах, але і па шматлікіх манаграфічных выданнях, якія былі прысвечаны даследаванню тэарэтычных пытанняў і творчасці асобных мастакоў.

У апошняй чвэрці XX стагоддзя айчыннае мастацтвазнаўства няспешна "паварочвалася" і ў бок выкарыстання семіятычнага метаду вывучэння выяўленчага мастацтва, у аснове якога былі ўвага да феномену знака, тыпалогіі знакаў і знакавых сістэм. Арыентацыя на семіятычнае пераасэнсаванне разнастайных з'яў мастацтва, практыкі яго інтэрпрэтацыі і ўспрымання сведчыла аб прынцыповай навізне і перспектыўнасці метаду. І разам з тым патрабавала засваення не толькі адпаведнага паняційнага апарату, разнастайных семіятычных канцэпцый, але і прынцыпаў мадэлявання камунікатыўных працэсаў. Некаторымі даследчыкамі семіятычны аналіз асобнага твора разглядаўся нават як альтэрнатыва фармальнага. Але семіятычныя даследаванні выяўленчага мастацтва так і не атрымалі шырокага распаўсюджання, хоць нярэдка і выкарыстоўваліся навукоўцамі для інтэрпрэтацыі мастацкіх твораў разам з іншымі метадамі.

У канцы 1970-х – 1980-я гады адбыліся зрухі ў развіцці тэорыі мастацтва, якія былі скіраваны на паглыбленне метадалогіі даследаванняў,

Рэпазіторый БДУ

пераадоленне спрошчаных схем аналізу. Менавіта ў 1980-я гады з'явілася немалая колькасць публікацый, прысвечаных актуальным пытанням метадалогіі сучаснага мастацтвазнаўства, метадалагічным пошукам у заходнім мастацтвазнаўстве. Зварот мастацтвазнаўства да пытанняў псіхалогіі мастацтва дапамог зразумець ролю псіхалагічных аспектаў мастацкай творчасці і мастацкага зместу, праблемы суадносін "мастацкага" і "псіхалагічнага". Накіраванасць на аналіз мовы мастацтва спрыяла станаўленню структуралісцкага і семантычнага метадаў, а ў канчатковым варыянце садзейнічала развіццю ў мастацтвазнаўстве навуковага комплекснага сістэмнага падыходу. Сістэмны падыход у мастацтвазнаўчым даследаванні патрабаваў распрацоўкі асобных яго метадалагічных аспектаў [11].

Апошнія дзесяцігоддзі XX стагоддзя ў рознай ступені падцвердзілі агульную тэндэнцыю, накіраваную на зварот да ўніверсальных метадаў даследавання мастацтва, да метадаў, якія здольныя "ахапіць усе ўзроўні гэтага феномена" [3]. Невыпадкова напрыканцы мінулага стагоддзя ўзаемадзеянне мастацтва і філасофіі вызначала асноўны вектар пошукаў метадалагічнага інструментарыя ў мастацтвазнаўстве. І тым не менш некаторыя мастацтвазнаўцы не звяртаючы ўвагі на імклівы час, кардынальныя змены ў сучасным мастацкім працэсе па-ранейшаму працягвалі практыку стварэння "мастацтвазнаўчых апавяданняў" у духу мінулых стагоддзяў. "Адносіны да гісторыі мастацтва як да энтамалагічнай калекцыі імкнуліся пераадолець многія, але практыка мастацтва (...) не маючы іншага інструмента, як і раней як матылькоў шпількай, замацоўвала творы на загадзя адведзеным ім месцы" [12]. Падобная дзейнасць не магла не выклікаць у асяроддзі прафесіяналаў сумненняў: можа і сапраўды "мова мастацтвазнаўства ўвайшла ў фазу вымірання і яна ўжо не можа выразіць патрэбную ступень складанасці выказвання"? [13]. Непапулярнасць складаных тэарэтычных канструкцый у мастацтвазнаўстве выдатна тлумачылася самімі ж даследчыкамі на прыкладзе гісторыі выкарыстання фармальнага метаду. "Вельфлінаўскі фармальны аналіз – аснова сучаснага мастацтвазнаўства – за больш чым сто гадоў выкарыстання застаўся мовай дасведчаных і незразумелы публіцы. Публіцы цікавей, калі змест пераказваецца, калі сэнсы тлумачацца, калі з нагоды мастацтва складаецца нейкі самадастатковы тэкст, які падмяняе ва ўспрыманні сам твор" [14].

Метадалогія на сучасным этапе даследавання мастацтва XX стагоддзя. Сёння мастацтва XX стагоддзя ўжо стала аб'ектам пільнай увагі як з боку мастацтвазнаўства, так і з боку другіх гуманітарных навук [15]. Сучасны плюралізм метадалагічных падыходаў у мастацтвазнаўстве прадвызначаны міждысцыплінарным характарам самой навукі і шматзначнасцю аб'екта даследавання. Але менавіта міждысцыплінарны падыход паўстаў як асноўны і найбольш прадуктыўны ў даследаванні мастацтва гэтага перыяду. Гуманітарныя веды, як вядома, займаюць цэнтральнае месца ў свеце навук, бо ў іх перасякаюцца патокі інфармацыі, якія ідуць ад усіх іншых галін ведаў. У сваю чаргу, менавіта мастацтвазнаўства аказалася той прасторай, дзе ў апошняй чвэрці мінулага стагоддзя пачалі распрацоўвацца асновы тэорыі і метадалогіі міждысцыплінарных даследаванняў. Узаемадзеянне мастацтвазнаўства з гістарычнай навукай, з філасофіяй мастацтва, эстэтыкай, культуралогіяй, сацыялогіяй паспрыялі больш грунтоўнаму аналізу мастацкіх з'яў, асноўных заканамернасцяў і прынцыпаў мастацкай эвалюцыі, садзейнічала фарміраванню цэласнай інтэграцыйнай тэорыі мастацтва. Кантакты мастацтвазнаўства з вышэй пералічанымі галінамі гуманітарных ведаў былі не проста механічным злучэннем розных навук. Гэта заўжды своеасаблівы комплексны і сістэмны сінтэз розных падыходаў да аналізу мастацтва. "У залежнасці ад пэўнай даследчай задачы саюзы мастацтвазнаўства са смежнымі навуковымі дысцыплінамі могуць змяняць сваю канфігурацыю, сваю меру адаптацыі адзін да аднаго" [16].

Зразумела, што разглядаючы спосабы інтэграцыі розных метадаў, варта выбіраць такую даследчую стратэгію, якая адпавядае прыродзе вывучаемага феномена і спрыяе больш поўнаму яго раскрыццю. Механічнае "змяшанне" розных па свайму зместу метадалагічных падыходаў наўрад ці можа прадставіць навукоўцам неабходны рабочы інструментарый для даследавання мастацтва XX стагоддзя.

Сярод сучасных мастацтвазнаўцаў відавочна імкненне ўдасканаліць, пашырыць даследчы апарат мастацтвазнаўства, аб'яднаць у прасторы гуманітарных ведаў яго розныя аспекты з мэтай асэнсаваць цэласны характар мастацтва XX стагоддзя. Аналіз канкрэтных праблем стылістыкі, вобразнасці і пластыкі мастацкіх твораў у працы мастацтвазнаўцаў усё часцей спалучаюцца з імкненнем разглядаць мастацтва ў шырокім кантэксце духоўных універсалій, у рэчышчы агульнай дынамікі

Репозиторий ВГУ

развіцця гістарычнага і мастацкіх працэсаў. Відавочна, што ў аналізе мастацкага твора няма нічога другараднага, нязначнага, а таму любыя дэталі, “дробязі” вельмі важныя, што патрабуе прачытання і асэнсаванне яго “з розных ракурсаў” і на розных узроўнях. Ступень метадалагічнага плюралізму, дамінуючая роля інтэрпрэтатыўнасці, як і сфера праблем, аб’ектаў, практык мастацтва ХХ стагоддзя, што зараз даследуюцца мастацтвазнаўцамі, здаецца яшчэ ніколі раней не былі такімі разнастайнымі. Сучасным даследчыкам зразумела, што метадалагічныя рэфлексіі і пошукі прынцыпова іншых метадалагічных перспектыў злучаны з разуменнем раўнапраўнасці і ўзаемадапаўняльнасці метадаў.

Асабліва актуальным становіцца не толькі вызначэнне ўнутраных сэнсаў вобразнасці, але інтэрпрэтацыя кантэкстуальных сувязяў. Напрыклад расійскі філасаф і метадолаг В. Розін прапануе “для навуковага вывучэння мастацтва прыцягнуць гуманітарны, семіятычны і схемалагічны падыходы” [17]. А вядомы спецыяліст па тэорыі мастацтва і міждысцыплінарных праблемах метадалогіі, прафесар Л. Ліманская мяркуе, што дзякуючы сваёй міждысцыплінарнасці іканалогія можа стаць адным з найбольш дынамічных напрамкаў, якія прагрэсіўна развіваюцца ў вывучэнні гісторыі мастацтва [18]. З пункту гледжання яшчэ аднаго даследчыка менавіта іканалагічны метад з’яўляецца найбольш прадуктыўным пры аналізе твораў выяўленчага мастацтва ХХ стагоддзя, нягледзячы на заўвагі яго заснавальніка (Э. Паноўскага), які сцвярджаў, што іканалогія здольна інтэрпрэтаваць толькі творы мастацтва не пазней XVIII ст. [19]. Пры гэтым большасць навукоўцаў сыходзяцца на тым, што толькі зварот да комплексных міждысцыплінарных даследаванняў, да кампаратывістыкі ў галіне мастацтвазнаўства ствараюць умовы для глыбокага асэнсавання, дасканалай і шматбаковай навуковай інтэрпрэтацыі мастацкіх з’яў, што адбываліся ў ХХ стагоддзі.

**Заключэнне.** Сучаснае мастацтвазнаўства заклапочана пошукамі найбольш эфектыўнай тэарэтыка-метадалагічнай стратэгіі вывучэння мастацтва, своеасаблівага метадалагічнага вектара, пры якім мастацтва ХХ стагоддзя стане аб’ектам комплекснага аналізу, не абмяжаванага толькі прыкладнымі даследаваннямі. Гэту задачу магчыма вырашыць лепш за ўсё на ўзроўні міждысцыплінарнага сістэмнага падыходу, выкарыстання ўсяго комплексу метадалагічных рэсурсаў.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Сарабьянов, Д. В. Некоторые методологические вопросы искусствознания в ситуации исторического рубежа / Д. В. Сарабьянов // Вопросы искусствознания. – М., 1995. – Вып. 1–2. – С. 5–14.
2. Субботина, О. В. Анри Фосийон и формальная школа во французском искусствознании / О. В. Субботина. // Петербургские искусствоведческие тетради [Текст]: [сборник статей по истории искусства] / [сост.: А. Г. Раскин, Н. Е. Фролова, Л. Н. Митрохина]. – СПб.: Изд-во Российской ассоциации искусствоведов, 1995. – Вып. 10. – СПб.: Роза мира, 2007. – С. 90–95.
3. Волобуев, В. А. Исследование искусства в западной эстетике: эволюция методологии [Текст] : автореф … дис. д-ра философ. наук : 09.00.04 / В. А. Волобуев. – М., 2001. – 44 с.
4. Лукичева, К. Л. История искусства после «новой истории искусства» / К. Л. Лукичева // История искусства после «новой истории искусства» // Новое литературное обозрение. – 2011. – № 112. – С. 364–374.
5. Философская, общенаучная и конкретно научная методологии в культурологических исследованиях. Теория культуры: учеб. пособие / под ред. С. Н. Иконниковой, В. П. Большакова. – СПб.: Питер, 2008. – С. 36–65.
6. Кривонденченков, С. В. Основные тенденции развития искусствоведческих методов исследования отечественного изобразительного искусства в ХХ в. / С. В. Кривонденченков // Весн. СПб. гос. ун-та культуры и искусства. – 2016. – № 4 (29). – С. 140–143.
7. Сидоров, А. А. Первые шаги советского искусствознания 1917–1921 / А. А. Сидоров // Искусство. – 1976. – № 1. – С. 45.
8. Богаевский, Б. Л. Задачи искусствознания / Б. Л. Богаевский // Задачи и методы изучения искусств: сб. – Пг., 1924. – С. 7–61.
9. Яворская, Н. В. Отделение искусствознания и социологическая секция Института археологии и искусствознания РАНИОН / Н. В. Яворская // Советское искусствознание: [сб. ст.]. / ред. В. М. Полевой [и др.]. – М.: Советский художник, 1982. – Вып. 1(16). – С. 269–296.
10. Лазарев, В. Н. О методологии современного искусствознания / В. Н. Лазарев // Критерии и суждения в искусствознании. – М.: Советский художник, 1986 – С. 91–95.
11. Прокофьев, В. Н. Художественная критика, история искусства, теория общего художественного процесса: их специфика и проблемы взаимодействия в пределах искусствоведения / В. Н. Прокофьев // Советское искусствознание’77. – М., 1978. – Вып. 2. – С. 233–265.
12. От редакции (вступительная статья) // Декоративное искусство. – 2001. – № 3. – С. 1.
13. Озерков, Д. Схемы правды / Д. Озерков // Новый мир искусства. – 1999. – № 1. – С. 36–37.
14. Зиновьева, Т. От изящных искусств к искусству пышных форм / Т. Зиновьева // Диалог искусств. – 2002. – № 5–6. – С. 75–78.
15. Попов, Е. А. Искусство в системе междисциплинарного взаимодействия наук и знаний: философия, культурология, социология, этнология, антропология, искусствоведение / Е. А. Попов // Философская мысль. – 2015. – № 12. – С. 135–149.
16. Стернин, Г. Ю. Искусствознание в системе гуманитарных наук / Г. Ю. Стернин // Два века (XIX–XX). Очерки русской культуры : сб. науч. ст. / авт. вступ. ст.: А. И. Морозов. – М.: Галарт, 2007. – С. 322– 328.
17. Розин, В. М. Особенности гуманитарного, семиотического и схемологического подходов как направлений научного изучения искусства / В. М. Розин // Культура и искусство. – 2015. – № 3. – С. 334–345.
18. Лиманская, Л. Теория искусства в аспекте культурно-исторического опыта. Исследования по теории и методологии искусствознания / Л. Лиманская. – М.: РГГУ, 2004. – 160 с.
19. Петренко, С. Д. Анализ произведений изобразительного искусства ХХ века (к проблеме методологии в педагогическом искусствознании) / С. Д. Петренко [Электронный ресурс] // Педагогика искусства: науч. электрон. журн., 2017. – № 1. – С. 119–124. – Режим доступа: http://www.art-education.ru/electronic-journal/analiz-proizvedeniy-izobrazitelnogo-iskusstva-xx-veka-k-probleme-metodologii-v. – Дата доступа: 10.02.2019.


*Паступіў у рэдакцыю 18.04.2019 г.*

Репозиторий ВГУ